*К. І. Шык, аспірант.*
*Навуковы кіраўнік – В. М. Навумчык,*
*доктар педагагічных навук, прафесар*

# ВОПЫТ ВЫХАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ Ў ЗАХОДНЯЙ КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасных геапалітычных і сацыяльна-эканамічных умовах патрыятызм уяўляе сабой маральную аснову жыццяздольнасці любой дзяржавы. Патрыятызм як каталізатар актыўнай грамадзянскай пазіцыі асобы рэалізуецца ў самаадданым служэнні Айчыне. Патрыятызм як ідэалогія ўяўляе сабой сукупнасць ідэй, канцэпцый, праграм, каштоўнасцей, норм па прынцыповых праблемах развіцця краіны і цесна звязаны з карэннымі інтарэсамі грамадзян, палітыкай і штодзённай грамадскай практыкай. Патрыятызм як якасць асобы чалавека выяўляецца ў любві да сваёй Радзімы, імкненні самааддана служыць свайму народу, захоўваць яго мову, культурную і гістарычную спадчыну, звычаі і традыцыі. Аднак у кожнай краіне існуе сістэма патрыятычнага выхавання, якая мае свае традыцыі, законы і нормы.

У ЗША апытанні грамадскай думкі паказваюць, што прыкладна тры чвэрці амерыканцаў адчуваюць пачуццё гонару за сваю краіну. Прыблізна палова амерыканскіх сем’яў упрыгожваюць свой дом нацыянальным сцягам, 15–20% вадзіцеляў усталёўваюць амерыканскі сцяжок на машыне. Дзевяць з дзесяці амерыканцаў адчуваюць пачуццё гонару, калі гучыць гімн краіны [1]. Аднак вызначанай дзяржаўнай праграмы па выхаванні патрыятызму ў ЗША няма. Значную ролю тут іграюць:

– інстытуты грамадзянскага грамадства. Пачуццё патрыятызму, гонару за сваю краіну прывіваецца ў ЗША з самага ранняга ўзросту бацькамі, школамі, універсітэтамі, усімі інстытутамі грамадства;

– актыўная прапаганда дзяржаўных знакаў праз СМІ. Большасць амерыканцаў ведаюць і спяваюць гімн краіны на ўрачыстых мерапрыемствах, наяўнасць амерыканскага сцяга ва ўсіх установах і шматлікіх пакоях хат з’яўляецца для іх нормай жыцця. Вырабы з нацыянальнай сімволікай карыстаюцца велізарнай папулярнасцю сярод насельніцтвы краіны;

– кінаіндустрыя ЗША – Галівуд.

На патрыятычнае выхаванне уплываюць таксама шматлікія грамадскія арганізацыі:

– байскаўты Амерыкі, якія налічваюць каля 3,8 млн сяброў;

– аддзяленне Сусветнай асацыяцыі дзяўчынак-правадыроў і дзяўчынак-скаўтаў (World Association of Girl Guides and Girl Scouts);

– арганізацыя «Маладая Амерыка»;

– арганізацыя «Маладыя амерыканцы за волю»;

– 11 верасня ў ЗША адзначаецца свята «Дзень патрыёта» [2].

Дадзеныя факты падкрэсліваюць, колькі надаецца ўвагі патрыятычнаму выхаванню з боку недзяржаўных арганізацый і простых амерыканцаў. Цікавы і той факт, што амаль усе дзяржаўныя і прыватныя школы ЗША пачынаюць заняткі з ранішняй лінейкі ў класах або спартыўных залах, дзе вучні ўсіх узростаў прамаўляюць словы «Клятвы вернасці сцягу», напісанай у 1892 г. да 400-годдзя адкрыцця Амерыкі, прыкладваючы руку да сэрца. Словы, якія пацвярджаюць тыя каштоўнасці і свабоду, што сімвалізуе амерыканскі сцяг, прамаўляюцца перад ім у якасці клятвы вернасці сваёй краіне: «Я клянуся ў вернасці сцягу Злучаных Штатаў Амерыкі і рэспубліці, якую ён сімвалізуе, адной нацыі пад Богам, непадзельнай, з воляй і справядлівасцю для ўсіх» [3]. Для ўздыму патрыятызму, у тым ліку і ў маладзёжным асяроддзі, найбуйнейшая ў Штатах кампанія-пастаўшчык дзяржаўных сцягоў і флагштокаў вырашыла бясплатна высылаць па пошце зорна-паласатыя сцягі памерам 1х1,5 метра ўсім жадаючым, што, на наш погляд, мае вялізнае значэнне ў падняцці патрыятызму сярод насельніцтва.

Павага да інстытутаў улады ЗША і да амерыканскай Канстытуцыі з’яўляецца для ўсіх натуральнай і звыклай справай. Такія вядомыя знакі ЗША, як амерыканскі сцяг, дзяржаўны гімн, статуя Свабоды, белагаловы арол, Белы дом і песня «Божа, блаславі Амерыку», даўно ўвайшлі ва ўжытак паўсядзённага жыцця.

У 2006 г. было апублікавана сацыялагічнае даследаванне, праведзенае амерыканскімі палітолагамі. Асноўная яго гіпотэза заключалася ў тым, што якасць калектыўнага навучання ў публічных школах вызначае ступень і характар індывідуальнай уцягнутасці студэнтаў у грамадзянскае жыццё і, у прыватнасці, у працэсы галасавання на выбарах. Падчас вывучэння феномену палітычнай сацыялізацыі на ўзроўні паводзінавых праяў аказалася, што ўздзеянне ўзораў калектыўных паводзін захоўваецца на працягу 10–15 гадоў [3]. Грамадзянская місія школы, як сведчылі дадзеныя даследаванні, зводзіцца да таго, каб «ідэалагічная і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

этнічная гетэрагеннасць пакрывалася агульнаамерыканскай гамагеннасцю… апорай на нацыю ў цэлым» [4, с. 27].

Тэндэнцыя, якая выявілася ў XXI ст. у сістэме адукацыі юных амерыканцаў, заключаецца ў тым, каб узаемна ўзмацніць рэлігійныя і патрыятычныя элементы выхавання. Пытанні аб значнасці публічных школ у культываванні веры набылі ў Амерыцы новае гучанне ў перыяд чарговага звароту да старых кансерватыўных каштоўнасцей, галоўнымі сярод якіх лічацца хрысціянская вера і патрыятызм. Гэтыя даныя сведчаць аб тым, што патрыятызм і рэлігію ў Амерыцы не падзяляюць, што, на погляд многіх навукоўцаў, вызывае непаразуменні сярод грамадства, якое складаецца з розных нацыянальнасцей і веравызнанняў.

Важна адзначыць і той факт, што Вашынгтон сталіца не толькі Злучаных Штатаў, але і вайсковых мемарыялаў Амерыкі. Ні ў адным горадзе свету няма такой канцэнтрацыі музеяў, помнікаў і ветэранскіх комплексаў, вядомых паўсюль высокім мастацкім узроўнем скульптурных кампазіцый і архітэктурных рашэнняў. 75-метровая Сцяна В’етнамскага мемарыяла, заглыбленая ў зямлю парка, з’яўляецца самым вядомым вайсковым помнікам ЗША. На паліраваную гранітную паверхню ў рост чалавека нанесены 58 256 прозвішчаў амерыканскіх вайскоўцаў, загінуўшых або зніклых без весткі ў Паўднёва-Усходняй Азіі паміж 1957 і 1975 гг. Люстраная паверхня сцяны дазваляе гледачу бачыць свой адбітак праз бясконцыя радкі імён загінуўшых у В’етнаме амерыканскіх салдат [2]. Гэты мастацкі прыём сумяшчэння ваеннай гісторыі з сённяшнім днём дазваляе аўтарам мемарыяла максімальна праўдзіва данесці да сучаснікаў трагічнасць лёсу ветэранаў усіх войн. Завяршэнне будаўніцтва комплексу ў 1984 г. дазволіла мільёнам людзей усвядоміць трагічны досвед бітваў, якія прайшлі, і ўбачыць у адзін момант каласальную колькасць імён загінуўшых салдат у гэтай жорсткай вайне.

Можна па-рознаму ставіцца да Амерыкі, яе законаў і войн, але нельга не аддаць належнае таму, як умеюць амерыканцы паважаць памяць аб сваіх загінуўшых. Амерыканскі патрыятызм «выскоквае» заўсёды нечакана і паўсюдна. Гэта і прыдарожныя стойкі з аб’явамі аб добраахвотнай бясплатнай здачы крыві, што размяшчаюцца ў самых нечаканых месцах: кінатэатрах, гандлёвых комплексах і нават у Мемарыяльным музеі-бібліятэцы Джона Кэнэдзі на беразе Атлантычнага акіяна. Гэта і адмысловыя кошты ў супермаркетах на асобныя прадукты і тавары ў дапамогу і падтрымку футбольнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каманды «Patriots» штата Масачусетс. Амерыканскія грамадзяне выстройваюцца ў чаргу ў адмысловай касы, патрыятычна пераплачваючы за купленае.

Асабісты патрыятызм даўно перастаў быць фармальным і палітызаваным, стаўшы часткай штодзённай культуры ЗША, а не дзяржаўнай праграмай і не выхаваўчым праектам службоўцаў. Дзяржава зрабіла падчас патрыятычнага выхавання галоўнае – дала амерыканцам ідэалогію асабістай свабоды, стабільную Канстытуцыю, незалежнасць судовай сістэмы і вяршэнства закона. Амерыканскія патрыёты перакананы, што заўтра будзе лепш, а паслязаўтра – яшчэ лепш. Дзеці заўсёды будуць жыць лепш за бацькоў, а ўнукі – лепш за дзяцей.

1. Інтэрнэт-партал «Навіны з усяго свету». – URL: http://washprofile. org. – Дата обращения: 07.04.2013.

2. Інтэрнэт-партал «Перспектывы патрыятычнага выхавання». – URL: http://www.nirsi.ru/104. – Дата обращения: 07.04.2013.

3. Інтэрнэт-партал «Рэлігія». – URL: www.newsru.com/religy/20apr 2007. – Дата обращения: 07.04.2013.

4. *Campbell, D. E.* Why we vote : how schools and communities shape our civic life / D. E. Campbell. – Princeton, 2006.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ